ВОГНЕННЫЯ ВЁСКІ

КРЫВАВЫ СЛЕД ХАТЫНСКІХ КАТАЎ

Сёння ўсяму свету вядома, што трагедыя беларускай вёскі Хатынь на Лагойшчыне, спаленай разам са 149 жыхарамі ў сакавіку 1943 года, жорскія расправы з партызанамі і мірнымі жыхарамі Міншчыны і Докшыцкага раёна Віцебскай вобласці — справа рук паліцаяў 118-га ўкраінскага батальёна. А далейшы шлях катаў пралягаў па Гродзенскай вобласці.

Пачаткам дзейнасці калабарантаў на новым месцы стала забойства начальнікам штаба батальёна Рыгорам Васюрам ні ў чым не вінаватага падлетка па прозвішчы Пудзелка на станцыі Наваельня Дзятлаўскага раёна. У хлопца, які бег па пероне, бразгала накрыўка чайніка. Васюры гэта не спадабалася. Ён затрымаў падлетка і стрэліў яму ў галаву з пісталета.

У ліпені 1943 г. батальён на працягу двух тыдняў знаходзіўся ў Навагрудку. Адтуль ён быў накіраваны ў Налібоцкую пушчу для ўдзелу ў карнай аперацыі супраць партызан і мірных жыхароў пад кодавай назвай «Герман». 118-ы батальён разам з іншымі гестапаўска-паліцэйскімі фарміраваннямі наступаў з боку Любчы, Іўя, Карэлічаў. А з усходу рухаліся іншыя карнікі, у тым ліку з эсэсаўскага батальёна Аскара Дзірлевангера — яшчэ аднаго ката Беларусі. Вялі баі з партызанскімі атрадамі, расстрэльвалі западозраных у сувязі з імі людзей, захоплівалі моладзь для адпраўкі ў Германію, рабавалі і палілі вёскі.

Сярод іншых трапіла ў рукі паліцэйскіх са 118-га батальёна Люда Сечка, дзяўчына з вёскі Чарэшля Навагрудскага (былога Любчанскага) раёна. Сувязную партызанскага атрада імя Катоўскага выратавала ад расправы толькі тое, што ніхто пра яе дзейнасць не ведаў. Разам з іншымі хлопцамі і дзяўчатамі Любу на аўтамашыне прывезлі на чыгуначную станцыю Наваельня і запіхнулі ў таварны вагон. Але да Германіі Люда не даехала: каля Баранавічаў у прыцемках яна выскачыла з цягніка і вярнулася ў свой партызанскі атрад.

Карная аперацыя «Герман» доўжылася з 4 ліпеня па 9 жніўня 1943 г. Паводле нямецкіх трафейных дакументаў, яна была выніковай. У сталіцу рэйха паведамлялі, што на тэрыторыі Навагрудскага, Іўеўскага, Карэліцкага раёнаў Гродзенскай вобласці, Валожынскага і Стаўбцоўскага раёнаў Мінскай вобласці падчас аперацыі забілі 4280 «бандытаў» (партызан), у тым ліку шэсць камандзіраў і двух камісараў, узялі ў палон 6654 чалавекі, у якасці рабочай сілы захапілі 9065 мужчын, 7801 жанчыну і 4178 дзяцей, рэквізавалі 6766 кароў, 9570 авечак, 1517 свіней, спалілі каля 75 населеных пунктаў.

Аднак на справе гэта выглядала інакш. Так, партызаны ўступалі ў бой, але такіх ахвяр яны не панеслі. Толькі адзінкі загінулі ці былі паранены, у палон ніхто не здаваўся. Пра гэта сведчыў, у прыватнасці, Міхаіл Лідзеяў, былы камандзір партызанскага атрада імя А. Андрэева брыгады «За савецкую Беларусь», які дзейнічаў у зоне Налібоцкай пушчы. Партызаны, калі станавілася відавочнай няроўнасць сіл, адыходзілі ў лес. А значыць, за перададзенай у Берлін статыстыкай забітых і ўзятых у палон стаялі пераважна жыхары і пакуты мірных жыхароў, якія дапамагалі партызанам.

У Лучынскім бары Налібоцкай пушчы, каля вёскі Каменная Слабада знайшлі себе сховішча некалькі яўрэйскіх сем'яў з Іўя і суседніх вёсак: Бакшты, Ладзуны і іншых. Жанчыны, дзеці, старыя — з паўсотні чалавек (дакладная колькасць невядомая) жылі ў трох вялізных зямлянках. Гэта быў іх апошні зямны прыстанак: карнікі са 118-га батальёна закідалі зямлянкі з людзьмі гранатамі. Жахлівыя сляды таго злодзейства ўбачылі гродзенскія следчыя (аўтар гэтага артыкула — адзін з іх), якія праз чвэрць стагоддзя пасля вайны вывучалі «баявы» шлях гэтага батальёна па беларускай зямлі.

Адзін з былых паліцаяў, удзельнік расправы, на допыце паведаў аўтару гэтых радкоў, што ў лесе яны затрымалі прыгожую дзяўчыну гадоў васямнаццаці-дзевятнаццаці. Яна, бяззбройная, была ў дазоры каля тых зямлянак, дзе хаваліся яўрэйскія сем'і. Паведамілі ў штаб батальёна. Хутка сюды прыскакаў на кані сам начальнік штаба Васюра, пачаў допыт. За інфармацыю пра партызан абяцаў захаваць дзяўчыне жыццё. Палонная не сказала нічога, трымалася з гонарам. Тут жа яе і расстралялі...

У жніўні-верасні 1943 г. 118-ы батальён удзельнічаў у карнай аперацыі пад кодавай назвай «Вандсберг» у Ліпічанскай пушчы, на тэрыторыі Слонімскага, Дзятлаўскага і Мастоўскага раёнаў. Потым штаб батальёна разам з яго шэфам, немцам Кёрнерам і здраднікам Васюрам, размясціўся ў Слоніме, а роты дыслацыраваліся ў раёне вёсак Альберцін і Дзераўная. Кёрнер трымаў справаздачу аб выніках карнай аперацыі ў Ліпічанскай пушчы перад высокім начальствам — гаўляйтарам Кубэ і генерал-маёрам паліцыі фон Готбергам. Тады батальёну прысвоілі іншы нумар (63 замест 118) і змянілі форму адзення — з рыжых латвійскіх даваенных мундзіраў на зялёны нямецкі мундзір з карычневым каўняром.

1 кастрычніка 1943 г. батальён перавялі ў Лідскі раён. Штаб знаходзіўся ў Лідзе, куды Васюра перавёз і сваю сям'ю. Тут у яго нарадзілася дачка. Каб адсвяткаваць гэтую падзею, абрабавалі навакольныя вёскі. Адабраныя ў людзей прадукты харчавання, свойскую жывёлу, самагон даставілі ў Ліду на некалькіх павозках. Пакуль рыхтаваліся да застолля, новаспечаны бацька — вельмі люты чалавек, нават да сваіх — заўважыў адкаркаваны і ўжо няпоўны буталь. Да спіны вінаватага ў гэтым прывязаліся мяшок з вільготным пяском вагой каля пяці пудоў, і той цэлы дзень поўзаў з ім па пляцы каля штаба. Гэты факт усплыў падчас следства і быў агучаны ў 1986 г. на судзе над Васюрам у Мінску.

У першай палове ліпеня 1944 г. 63-і батальён знаходзіўся ў Гродне, потым разам з адступаючай гітлераўскай арміяй прыбыў у польскі горад Ломжу. Са сваёй сям'ёй — жонкай і трыма дзецьмі, народжанымі падчас вайны, — адступаў на захад і Васюра. На некалькіх фурманках везлі нарабаваную ім у беларускіх сялян маёмасць — галоўным чынам, дробную свойскую жывёлу.

...Летам 1944 г. у французскім горадзе Страсбургу гітлераўцы сфарміравалі з паліцэйскіх 62-га і 63-га батальёнаў, якія адступілі з тэрыторыі Украіны і Беларусі, брыгаду імя Зінгеля. Яе размясцілі ў ваенным гарадку Вальдагон паблізу горада Безансон. Там паліцэйскія вялі баі з французскімі партызанамі і народнымі апалчэнцамі арміі Шарля дэ Голя. Частка паліцэйскіх з ліку радавых напярэдадні капітуляцыі Германіі далучылася да французскага Руху супраціўлення. Большасць жа працягвала служыць гітлераўскаму рэйху да заканчэння ваенных дзеянняў, а потым усяляк намагалася ўхілiцца ад рэпатрыяцыі на Радзіму. Тыя, каму гэта ўдалося, рассеяліся па ўсім свеце. Адзін з іх, 91-гадовы Уладзімір Катрук, сёння жыве ў Канадзе. Яго вылічыў летась цэнтр Сімона Візенталя, які займаецца вышукам жывых нацысцкіх злачынцаў. Праваабаронцы гэтага цэнтра заклікаюць канадскія ўлады экстрадзіраваць Катрука ў Еўропу, каб ён прадстаў перад судом.

Яўген ДАЛІДОВІЧ,
удзельнік Вялікай Айчыннай вайны, былы старшы следчы-крыміналіст па асабліва важных справах упраўлення КДБ па Гродзенскай вобласці,
Святлана МАРОЗАВА,
доктар гістарычных навук, прафесар ГрДУ імя Янкі Купалы

■ Гэта мы, Госпадзі...

НЕ ДАСТАВАЙСЯ Ж НІКОМУ!..

Дзве быццам бы розныя гісторыі кахання з аднолькавым трагічным фіналам. Яны адбыліся летам і зноў жа — на Гомельшчыне. Вось напісала — «кахання» — і вельмі засумнявалася: ці было яно насамрэч? Пра «пяшчотныя пачуцці» сухой мовай крымінальных артыкулаў сёння разважаюць праваахоўнікі.

СМЯРОТНА ЗАКАХАНЫ

У чэрвені, за два дні да атрымання дыплома аб заканчэнні ВНУ, не вярнулася дадому 23-гадовая жыхарка Рэчыцы. Цела дзяўчыны было знойдзена ў лясным масіве паблізу ад райцэнтра.

Следчы па асабліва важных справах следчага ўпраўлення СК РБ па Гомельскай вобласці Ганна ДЗЯТЛАВА расказвае, што падазроным у здзясненні забойства адразу ж стаў малады чалавек, таксама выпускнік Мазырскага ўніверсітэта, з якім дзяўчына сустракалася год таму — але ж потым аддала перавагу іншаму:

— Злачынца — грамадзянін Расіі, але ж яго маці жыве ў Жлобінскім раёне. Ён — самы малодшы з чацвярых дзяцей. Бацька пайшоў з сям'і, калі Н. быў яшчэ дашкольнікам. Хлопчык добра вучыўся ў школе, ніколі не піў, на дыскатэкі не хадзіў, па доме маці дапамагаў. Ні ў чым дрэнным заўважаны не быў. Ва ўніверсітэце вучыўся на спецыяльнасці «англійская-нямецкая мовы». Да знаёмства з Лізаветай у яго не было сур'ёзных узаемаадносін. Яны сустракаліся некаторы час: Н. здымаў кватэру, дзяўчына перыядычна там жыла. Праз некаторы час ёй стала няўтульна. Малады чалавек чапляўся па дробязях: не так паклала ложку, не выцерла кроплі ў ванне, туфлі не так паставіла, не адразу адказала па тэлефоне... Калі ёй гэта надакучыла, яна разарвала адносіны.

А ў яго гэта было першае каханне, і яе вельмі хацеў яе вярнуць: закідваў СМС-камі, прыходзіў з букетамі кветак, прасіў усіх знаёмых іх памірыць, спяваў ёй серэнады пад балконам... Але ж дзяўчына яго ўпарта ігнаравала. Усе сяброўкі загінулай гавораць: ён на працягу года «дастаў» Лізаветы сваім каханнем.

Калі былі здадзены ўсе экзамены, выпускнікі раз'ехаліся па дамах і павінны былі вярнуцца ў Мазыр толькі для святочнага атрымання дыплома. І менавіта ў гэты час хранічна закаханы выпадкова прыехаў у Рэчыцу са сваім аднагрупнікам. Той застаўся віншаваць бабулю з днём нараджэння, а Н. позна вечарам папрасіў у яго машыну і зноў паехаў да дзяўчыны.

Паказанні, якія даў грамадзянін пасля прад'яўлення яму абвінавачвання, сведчаць, што яны з дзяўчынай накіраваліся за горад, да вёскі Воўчая гара. Спыніўшыся на пляцоўцы каля леса, ён зноў прызнаўся ў каханні і прасіў яе вярнуцца. Аднак дзяўчына адмовіла катэгарычна. Далей, магчыма, было высвятленне адносін з дапамогай рукапрыкладства. Малады чалавек кажа, што намацаў нешта вострае на падлозе ў машыне і, каб абараніцца нанёс дзяўчыне ўдар. Эксперт сведчыць, што металічны прадмет даўжынёй 6 см і шырынёй 2 см трапіў пад вока і закрануў жыццёва важныя органы — дзяўчына памерла практычна імгненна. Злачынца вынес цела з машыны, прыкрыў яго сухімі веткамі, травой, лісцем і паехаў у Рэчыцу, каб вярнуць машыну. Сябру сказаў пра канфлікт з дзяўчынай, пра тое, што пакінуў яе там, дзе пасварыліся, а кроў у машыне растлумачыў бойкай, якая адбылася. Ужо ў Мазыры Н. старанна вымыў машыну і апрацаваў спрэем. Сваё адзенне выкінуў на сметнік. На наступны дзень пачаў тэлефанаваць яе бацькам з пытаннем: дзе Лілія? Прасіў, каб яму паведамілі, калі знойдзецца. Так ён тэлефанаваў тры дні запар, пакуль дзяўчыну не знайшлі супрацоўнікі міліцыі. У месцы, дзе аператыўнікі прачэсвалі лес, спрацаваў мабільнік дзяўчыны...

Эксперты характарызуюць Н. як педантычнага, скрупулёзнага, раздражняльнага, нешматслоўнага. Знешне — без эмоцый. У яго вялікія патрабаванні да парадку і чысціні. Дарэчы, гэтыя свае рысы характару ён старанна ўтойвае, бо лічыць іх не вельмі прыгожымі.

ПАКАРАННЕ ДЛЯ МАРЫНЫ

23-гадовая гамяльчанка таксама стала ахвярай таго, хто без яе свайго жыцця не ўяўляў.

У ліпені ў аддзел унутраных спраў адміністрацыі Савецкага раёна Гомеля з заявай пра знікненне сястры звярнулася жыхарка абласнога цэнтра. Па словах жанчыны, ёй патэлефанаваў сужыцель сястры і расказаў, што яго каханая не вярнулася дадому. Марына, якая ведала тры замежныя мовы і займалася рэпетытарствам, пайшла з дому на індывідуальныя заняткі, але назад не вярнулася. Мабільны яе быў не даступны.

Старшы следчы следчага ўпраўлення Максім КАЛЯНЧУК гаворыць, што ў кола падазроных адразу ж трапіў малады чалавек, разам з якім дзяўчына калісьці наведвала секцыю па каратэ, а потым непрацяглы час сустракалася:

— Два месяцы стасункаў далі магчымасць зразумець, што гэта не мужчына яе мары. Напрыклад, ёй не падабалася, што малады чалавек вельмі грубы са сваёй маці. Дарэчы, дзяўчына не хацела пакрыўдзіць закаханага ў яе хлопца і вельмі доўга рыхтавалася, каб сказаць яму пра развітанне. С., электраманцёр аднаго з буйных гомельскіх прадпрыемстваў, непрыемную навіну прыняў знешне спакойна. Не паказаў віду, што пакрыўдзіўся. Потым неаднаразова спрабаваў наладзіць кантакты: чакаў каля пад'езда, прасіў паразмаўляць. Яна на гутарку не ішла. Але аднойчы згадзілася пагаварыць, а ў выніку ён пачаў яе збіваць у пад'ездзе. Тады С. быў прыцягнуты да адміністрацыйнай адказнасці за прычыненне лёгкіх цялесных пашкоджанняў. Дзяўчына ж была ўпэўнена, што ён хацеў яе забіць. Маці Марыны расказала, што пасля гэтага ён пачаў яе высочваць: дзе яна і з кім. Аднойчы дзяўчына атрымала свой фотаздымак, які быў зроблены ў перыяд зносін з С. — на фота ў яе былі выкалаты вочы.

Намер забойства ў галаве злачынцы ўзнік у пачатку 2013 года, калі дзяўчына пачала сустракацца з іншым хлопцам. Сваякі гавораць, што маладыя здымалі кватэру, а на лета планавалі выселле. Новыя стасункі прыносілі Марыне шчасце, але ж пры гэтым яе літаральна праследваў С. Менавіта таму яна баялася вяртацца дадому адна і пастаянна прасіла яе праводзіць. Былы паклоннік не толькі працягваў за ёю сачыць, але і загадзя, яшчэ ў красавіку, выкапаў у лесе яму.

Да таго ж С. пераканаў паўдзельнічаць у здзяйсненні злачынства сваіх знаёмых — маладую сямейную пару. Патэлефанавалі Марыне наконт рэпетытарства для дзіцяці, і тая згадзілася на сустрэчу. Дзверы будучай ахвяры адчыніла маладая жанчына. Яна ж накінула хустку на яе галаву, а С. малатком нанёс удары, ад якіх дзяўчына памерла. Цела загарнулі ў коўдру, зашылі, потым закаталі ў дыван. З кватэры вынеслі сярод белага дня, а потым вывезлі ў лес у багажніку легкавога аўтамабіля і закапалі ў прыгатаванай яме.

Сёння сужэнцы кажуць, што не хацелі дапамагаць С., але ён ім пагражаў. Быццам баялісяза сваіх двух зусім маленькіх дзяцей. Між тым вядома, што, акрамя забойства, яны разам планавалі і іншыя дзёрзкія злачынствы на тэрыторыі Гомеля. Урэшце, марылі з'ехаць з Гомеля і пачаць бязбеднае жыццё.

Што тычыцца самога С., галоўнага арганізатара і выканаўцы забойства, ён вырас, можна сказаць, на вуліцы. Выхоўваўся адной маці: бацька даўно памёр. Прыцягваўся да крымінальнай адказнасці за крадзеж і да адміністрацыйнай — за парушэнне правілаў дарожнага руху. Падазраваўся ў здзяйсненні іншых злачынстваў. Усе знаёмыя характарызуюць яго адмоўна: грубы, дзёрзкі, па слова ў кішэню не лезе.

— С. кажа, што страшнае злачынства стала для яго выйсцем: «Можа, у мне няма Бога — але я не шкадую аб здзейсненым, мне стала лягчэй», — пераказвае словы забойцы намеснік начальніка ўпраўлення Следчага камітэта РБ па Гомельскай вобласці Юрый Дзям'янчык.

РОДАМ З ДЗЯЦІНСТВА

Аналізуючы паводзіны гэтых зладзеяў, **старшы выкладчык кафедры філасофіі, гісторыі, паліталогіі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта транспарту, псіхолаг Таццяна САСНОЎСКАЯ** адразу ж пазнае ў абодвух забойцах рысы пэўнага тыпу характару:

— Тут не ідзе размова пра псіхічнае захворванне. Звычайна прычыны такіх адхіленняў — вялікія крыўды на маці і няправільнае выхаванне ў раннім дзяцінстве, адсутнасць бацькі як станоўчага прыкладу для пераймання і несфарміраваныя маральныя прынцыпы. Пры правільным выхаванні людзі з такім тыпам характару могуць стаць лепшымі мужчынамі на свеце: надзейнымі, клапатлівымі, пяшчотнымі, вернымі — будуць усё жыццё любіць толькі адну жанчыну. А вось пры фрустрацыі (негатыўным псіхічным стане, абумоўленым немагчымасцю задавальнення тых ці іншых запатрабаванняў), яны могуць стаць злапамятнымі, крыўдлівымі і помслівымі садыстамі. Такія мужчыны пачынаюць крыўдзіцца не толькі на маці, але і на ўсіх жанчын увогуле.

У такіх людзей з дзяцінства ёсць здольнасць да апрацоўкі інфармацыі, у іх вельмі добрая памяць. З іх могуць атрымацца эрудыты, і ў той жа час яны могуць стаць мсціўцамі. Дарэчы, надзвычайная схільнасць да навядзення парадку гаворыць пра наяўнасць негатыўнага псіхічнага стану. Чалавек пачынае наводзіць ідэальны парадак вакол сябе. Гэтай якасцю ён вельмі «дастае» тых, хто побач. Педантычнасць, як бы «гасіць» іх трывожнасць. А потым неперажытыя, закамуфліраваныя псіхалагічныя траўмы пераходзяць у агрэсію... У такіх людзей вялікі страх быць знясланым, і таму яны абавязкова караюць тых, хто іх зганьбіў.

У абодвух злачынцаў не было станоўчага прыкладу ў выглядзе бацькі. Магчыма, маці выкарыстоўвалі не тыя метады выхавання, якія былі патрэбны менавіта для гэтага тыпу характару. Не было ў маладых людзей і дакладных маральных арыенціраў, якія дазваляюць стрымліваць негатыўныя рысы характару...

Ірына АСТАШКЕВІЧ

Студэнты БДУ выстаўляюць сваім выкладчыкам адзнакі

Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт з'яўляецца ўдзельнікам некалькіх міжнародных рэйтынгаў ВНУ. Цяпер дзейнасць БДУ будзе ацэньвацца таксама і па крытэрыях міжнароднага рэйтынгу U-Multirank.

Новая сістэма ранжыравання вышэйшых навучальных устаноў была прынята Еўрапейскім саюзам 30 студзеня 2013 года ў Дубліне. Большасць дзейных сусветных рэйтынгаў галоўнае значэнне надаюць навукова-даследчай рабоце ўніверсітэтаў, не ўлічваючы іх шматпрофільнасці. Рэйтынг U-Multirank абапіраецца на пяць крытэрыяў: выкладанне і паспяховасць, даследаванні, абмен вопытам, міжнародная арыентацыя і рэгіянальнае значэнне ВНУ. Пры гэтым кожны год плануецца ацэньваць розныя профілі падрыхтоўкі студэнтаў, якія будуць вызначацца аргкамітэтам. У 2013 годзе вылучаны чатыры профілі: Business (эканоміка прадпрыемства, кіраванне, менеджмент); Electrical engineering (інжынерныя спецыяльнасці: электратэхніка, электроніка, інфармацыйныя тэхналогіі); Mechanical engineering (інжынерныя спецыяльнасці: машынабудаванне, прыборабудаванне, механіка) і Physics (фізіка).

Лепшы ўніверсітэт будзе вызначацца на падставе статыстычных звестак, якія падаюцца ВНУ, і па выніках апытання яго студэнтаў. У БДУ ацэнкі сваёй «альма-матар» ужо пачалі выстаўляць студэнты фізічнага факультэта, факультэта радыёфізікі і камп'ютарных тэхналогій, механіка-матэматычнага, эканамічнага факультэтаў, факультэта міжнародных адносін, а таксама Інстытута бізнесу і менеджменту тэхналогій і Дзяржаўнага інстытута кіравання і сацыяльных тэхналогій. Менавіта на гэтых факультэтах студэнты навучаюцца па профілях, якія ацэньваюцца ў новым міжнародным рэйтынгу сёлета.

Надзея НІКАЛАЕВА.

І АБАВЯЗКОВА — НАТХНЕННЯ!



Ад імя кіраўніка сельгаспрадпрыемстваў Брэстчыны віншую намесніка старшыні абласнога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Красеўскую Любоў Мікалаеўну з юбілеем. Учарашняя творчая вечарына, што адбылася ў горадзе над Бугам, яшчэ раз засведчыла бясспрэчны талент расійскай паэткі на берасцейскай зямлі. Ад шчырага сэрца жадаем Вам, шаноўная Любоў Мікалаеўна, новых творчых узлётаў, важкіх вынікаў у справе яднання брацкіх беларускага і расійскага народаў, натхнення і асабістага шчасця.

З павагай,
Міхаіл Мікалаевіч Страпко, старшыня Брэсцкага абласнога аграпрамсаюза.
УНП 200193308

АСІЛКІ МОЦ БЯРУЦЬ АД РОДНАЕ ЗЯМЛІ

Гісторыка-этнаграфічнаму музею кафедры філасофіі і гісторыі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры — 20 гадоў

За акном архітэктурны пейзаж сучаснай сталічнай забудовы, а па гэты бок — інтэр'ер вясковай хаты: паліцы з ручнікамі, шырокі стол, чыста габляваныя драўляныя лавы. Мы з вамі знаходзімся ў аўдыторыі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта фізічнай культуры, уваход у якую ўпрыгожаны шыльдай з выразанымі на дрэве словамі: «Гісторыка-этнаграфічны музей».

Асобае месца ў калекцыі кніг займаюць выданні для вернікаў прадстаўленых у Беларусі канфесій.

Заснавальнік і нязменны дырэктар музея Сяргей Мышапуд са студэнтамі Андрэем Шышко і Георгіем БАРЫСЕНКАМ.

Менавіта з пытання пра назву на гэтай шыльдзе пачалася наша размова з **арганізатарам і нязменным дырэктарам музея, кандыдатам гістарычных навук, дацэнтам Сяргеем МЫШАПУДАМ.**

— У інжынернай ВНУ ёсць музей палітэхнічны, у мастацкай — музей скульптуры і жывапісу, чаму ва Універсітэце фізічнай культуры ўзнікла, на першы погляд, зусім не профільная гісторыка-этнаграфічная экспазіцыя?

— Яна пачала стварацца гадоў дваццаць таму, — расказвае Сяргей Мышапуд, — але і ў той час не было задумкі стварыць музей, адпаведны прафесійнаму напрамку студэнтаў. Безумоўна, большасць нашых студэнтаў — выдатныя спартсмены, але сярод іх шмат заўзятых аматараў музыкі і спеваў, жывапісу і дэкаратыўнага мастацтва, тэхнікі і электронікі. Адкуль бы яны ні прыехалі вучыцца ў сталіцу — успаміны пра родны кут заўжды застануцца для іх самымі дарагімі. Памятаеце легенду пра волата, які падтрымліваў сваю моц, калі кранаўся роднай зямлі? Сувязь з малой радзімай павінна заставацца.

— А якія экспанаты становяцца «сувязнымі» паміж студэнтам і яго роднымі мясцінамі?

— Гэты выбар робіць сама моладзь. Асаблівасць музея ў тым, што фонды фарміруюцца з рэчаў, якія прыносяць студэнты. У нашых залах выстаўлены прадметы побыту вяскоўцаў і гараджан мінулых часоў, тэхнічныя прылады, узоры перыядычных выданняў, фрагменты амуніцыі вайскоўцаў, археалагічныя знаходкі, вырабы таксідэрмістаў (рэдкая калекцыя галоў насельнікаў беларускіх рэк і азёраў). Сёння музей мае амаль 1400 экспанатаў — гэта не толькі рэчы, але і фільмы, здымкі, гуказапісы. Карацей кажучы, кожны дорыць музею тое, што нагадвае яму самому пра сённяшні дзень ці мінулае яго радзімы.

Ёсць сярод экспанатаў рэчы, якія даносяць звесткі пра лёс нашых землякоў у мінулыя часы. Так, студэнты з Брэсцкай вобласці падарылі музею частку маляўніча вышытага старога ручніка. Другая яго частка ў гады Вялікай Айчыннай вайны выратавала некалькіх вяскоўцаў ад згону ў Германію: нямецкі салдат згадзіўся вызваліць людзей у абмен на прыгожы ручнік. Шмат дзесяцігоддзяў праляжала ў куфры гэта сямейная рэліквія, цяпер яна на ганаровым месцы ў музеі разам з апісаннем падзеі сямідзесяцігадовай даўніны.

Не менш цікавыя іншыя часткі экспазіцыі. Ёсць тут збор багаслоўскай літаратуры, якая выдаецца для праваслаўных, католікаў, іўдзеяў. Нават Евангелле на цыганскай мове ёсць у гэтай рэдкай калекцыі. Музейны раздзел, прысвечаны розным канфесіям, дапаўняюць рэчы, перададзеныя замежнымі студэнтамі. Побач з Каранам на арабскай і рускай мовах можна бачыць Псалтыр на італьянскай. Побач з егіпецкім папірусам — камплект польскіх калядных паштовак.

— Наш музей адчынены не толькі для экскурсій, — працягвае Сяргей Мышапуд, — тут праходзяць семінарскія заняткі па культуралогіі, сюды звяртаюцца студэнты, якія працуюць над рэфератамі, прысвечанымі культуры і побыту беларускага народа. Мы не толькі збіраем і захоўваем, але даследуем і папулярызуем этнаграфічную спадчыну, праводзім дыспуты і канферэнцыі па вывучэнні хрысціянскіх каштоўнасцяў. Музей нашай кафедры не толькі спрыяе працэсу фарміравання нацыянальнай самасвядомасці моладзі, але і пашырае яе веды пра іншыя народы, іх мастацтва і побыт.

Як у кожным музеі, ёсць тут свая Кніга водгукаў. Запісы ў ёй зроблены ў розныя гады, на розных мовах свету. Свае словы падзякі стваральнікам экспазіцыі пакінулі беларускія і замежныя студэнты, навукоўцы, палітыкі, дзеячы мастацтва. У знак узаемнай павагі да гасцей, кнігу захоўваюць у шыкоўным інкруставаным футляры, вартым заняць месца ў калекцыі вырабаў народных майстроў.

Дарэчы, старонкі Кнігі водгукаў таксама з'яўляюцца экспанатам музея гісторыі і этнаграфіі, бо на іх засведчана павага да нашай агульнай спадчыны.

Яўген ПЯСЕЦКІ.
Фота аўтара.

Студэнтка Дар'я Нічыпарук: некаторыя прадметы адзення замежнай калекцыі можна нават прымерыць!

Гэтыя экспанаты асабліва цікавыя для канькабежцаў. На драўляных каньках дзятва каталася ў далёкія часы, а на жалезных «снягурках» — у мінулым стагоддзі.

■ Стоп — гвалту!

НЕДЗІЦЯЧЫ «РАКУРС» З СЕЦІВА

Каля 70 працэнтаў правапарушэнняў, звязаных з дзіцячай парнаграфіяй, здзяйсняецца з выкарыстаннем магчымасцяў «глабальнай павуціны». Злачынцы здымаюць непрыстойнае відэа з удзелам дзяцей і выкладваюць яго ў інтэрнэт, а таксама шукаюць з дапамогай сацыяльных сетак новых ахвяр.

— Сёлета за 9 месяцаў былі выяўлены 103 ахвяры педафілаў. 75 дзяцей з гэтай колькасці — малалетнія. У здзяйсненні злачынстваў падазраецца 53 чалавекі, — паведаміў намеснік начальніка ўпраўлення па наркакантролі і супрацьдзеянні гандлю людзьмі крымінальнай міліцыі Міністэрства ўнутраных спраў Сяргей Коўтун.

У сувязі з такой сітуацыяй праваахоўнымі органамі пастаянна вядзецца маніторынг дзіцячых дамоў-інтэрнатаў і навучальных устаноў. На жаль, вядомы выпадкі гвалтоўных дзеянняў у дачыненні да дзяцей, якія здзяйсняліся настаўнікамі і выхавацелямі.

Непаўналетнія, што жывуць у сем'ях, таксама маюць рызыку аказацца пацярпелымі ад сексуальных злачынстваў. Прычым не заўжды ў такую сітуацыю трапляюць малыя з сацыяльна нестабільных сем'яў. Па словах Сяргея Коўтуна, пэўная частка непаўналетніх, што сталі ахвярамі аматараў дзіцячай парнаграфіі, сапраўды паходзяць з нядобранадзейных сем'яў. Але нярэдкія і выпадкі, калі пацярпелыя выхоўваюцца ў сем'ях, дзе атмасфера з'яўляецца абсалютна нармальнай.

Нельга адназначна апісаць і «сярэднестатыстычнага» злачынцу. Сярод іх ёсць як асобы, што вядуць асацыяльны вобраз жыцця, так і знешне прыстойныя, забяспечаныя людзі.

Як расказаў Сяргей Коўтун, у Беларусі пастаянна ўдасканальваецца заканадаўства ў галіне абароны дзяцей ад гвалту сексуальнага характару. Так, у 2008 годзе ў Крымінальны кодэкс быў уведзены артыкул, які прадугледжвае адказнасць за дзіцячую парнаграфію з пакараннем да 13 гадоў пазбаўлення волі з канфіскацыяй маёмасці (замест чатырох гадоў, як гэта было раней). Максімальны тэрмін пакарання ўжо атрымалі некалькі злачынцаў. Сёлета, з улікам тэндэнцый развіцця злачыннасці такога тыпу, супрацоўнікамі праваахоўных органаў была ўнесена прапанова аб павышэнні крымінальнай адказнасці да 10 гадоў пазбаўлення волі (замест 5 гадоў) за сексуальны кантакт з асобай, што не дасягнула 16 гадоў.

Таццяна ГАЙС